Людзьмі звацца!
Янка Купала.

СПРАВА

№ 6
Красавік
2012 г.

http://vk.com/id168308417

Выдаецца з лютага 2012 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ МАГІЛЁЎСКАГА РАЁНА


Віншуем!



Вернікаў усіх рэлігійных канфесій віншуем з Вялікаднём! Зычым добрага здароўя, шчасця, дабрабыту, здзяйснення жаданняў і ўсяго самага найлепшага!

Візіт





Напярэдадні Вялікадня настаяцель храма святога Панцелеімона ў в.Кадзіна айцец Васіль (Рэвель) зрабіў некалькі пастырскіх візітаў у навакольныя вёскі. 14 красавіка ён наведаў в.Брылі, дзе блаславіў вернікаў і асвяціў велікодныя гатункі. Брылёўцы з вялікай увагай выслухалі святара і ў сваіх сэрцах панеслі ад гэтай сустрэчы святочную ўзнёсласць.

З Велікоднага звароту айца Васіля

Некалькі тысяч гадоў таму людскія душы гінулі. Калі прыйшоў Гасподзь Ісус Хрыстос, ён зрабіў новазапаветную Пасху і пазбавіў усіх людзей ад смерці. Ён даў людзям жыццё – жыццё вечнае, бессмяротнае. Кожны чалавек – бессмяротны, і бессмяротная ягоная душа. *«Пасха»* перакладаецца як *«збаўленне ад смерці»*. Пасха Хрыстова – гэта і ёсць жыццё.. Бо Гасподзь памёр і ўваскрэс -- і даў гэта жыццё ўсім людзям.

Я бы хацеў пажадаць, дарагія мае, каб вы былі годныя гэтага жыцця і па-сапраўднаму пражылі яго так, як запаведваў жыць Хрыстос. Сапраўднае жыццё і свабода – у Боге, у Хрысце, які ўваскрэс. Усіх вас віншую з Велікаднём Хрыстовым. Беражы вас Гасподзь! Хрыстос уваскрэс!

Падрыхтаваў Сяргей ПІСЬМЕННЫ.

Распрадажа

У Магілёўскай вобласці могуць быць выстаўлены на продаж кантрольныя пакеты адразу сямі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Яны ўнесены ў абласны план прыватызацыі на 2012 г.

У мясцовых уладаў з'явілася жаданне знайсці інвестара на сельгасугоддзі Магілёўскага, Бабруйскага, Горацкага, Клімавіцкага. Мсціслаўскага і Шклоўскага раёнаў.

На конкурсныя таргі, у прыватнасці, плануецца выставіць 99,9% акцый ТАА "Барок-агра" - гаспадаркі Магілёўскага раёна, якое спецыялізуецца на вытворчасці зерневых, зернебабовых, а таксама свіней.

Трэба адзначыць, што менавіта ў Магілёўскай вобласці створаны буйнейшыя ў краіне прыватныя аграпрамысловыя холдзінгі. Уладальнікам аднаго з іх, "Серваллюкс", які таксама месціцца ў Магілёўскім раёне і спецыялізуецца на птушкаводчым накірунку, з'яўляецца Яўген Баскін.

Міхась БАРАЗНА.

У працяг тэмы

Каб падоўжыць жыццё закінутых беларускіх вёсак, улады гатовы іх аддаваць інвестарам, у тым ліку і фізічным асобам, пад турыстычныя аб'екты амаль за так -- абы толькі людзі імі займаліся. Аб гэтым паведаміў намеснік міністра спорту і турызму Чэслаў Шульга.

Сёння ў Беларусі досыць шмат вёсак, у якіх не жыве ніводнага чалавека. Зараз ідзе праца над тым, каб знайшліся людзі, якія, няхай за адну базавую велічыню (100.000 рублёў), маглі выкупіць гэтыя вёскі і адбудаваць іх пад турыстычныя патрэбы. Пры жаданні інвестары могуць узяцца не толькі за закінутыя, але і за дзеючыя вёскі. Як гэта, напрыклад, зрабіў адзін з беларускіх бізнэсменаў, які зарабіў свой капітал у Ленінградскай вобласці і ў Пружанскім раёне выкупіў усю вёску, дзе жыла яго маці, зрабіўшы там турыстычны і спартыўны комплексы.

Закінутая хата ў в. Малееўка Магілёўскага раёна



Иван ПЕХТЕРЕВ "Деревни уходящие"

Сгорбленные плечи
Старых деревень...
Их печаль мне плещет
В душу каждый день.

Тут живут давненько
Старики одни,
Как их деревеньки,
Горбятся они.

А они ж растили
Столько лет хлеба,
Были в звонкой силе,
Да лиха судьба.

Им хватает пенсий
За нелёгкий труд,
Но хороших песен
Не хватает тут.

Нету перспективы,
Хоть у них вокруг
Те ж леса и нивы,
Тот же зелен луг.


Свадеб не хватает,
Ах, беда, беда!..
...Без детей летают
Аисты сюда.

"Зямля і людзі", 10.02.2010 г.

Традыцыя

У гэтым годзе суботнікаў было ажно тры - на працягу красавіка мы дружна наводзілі прыгажосць навакольнага асяроддзя. Гэта добра - калі навокал прыгожа. І супольная праца на свежым паветры мае свае плюсы. Але ўсе гэтыя плюсы *"праздника освобождённого труда"* перакрэслівае думка аб тым, што табе за гэтую працу (не самую лёгкую ды чыстую) ніхто не заплаціць аніякага заробку, а, наадварот, у цябе грошы забяруць. Перад суботнікам, як вядома, на ўсю краіну агучваецца лічба плануемага агульнага заробку - усё гэта дзеліцца на працаўнікоў, і кожны *павінен* аддаць у тую капілку сваю частку пянёнзаў. Напрыклад, з работнікаў культуры нашага раёна збіралі па 50.000 рублёў. Відаць, самыя багатыя гэтыя работнікі. І калі раней гэтая працэдура абстаўлялася словамі *"калі ласка"* і *"па магчымасці"*, то зараз робіцца ўсё проста: *"Вы абавязаны!"* Узнікае пытанне: "Каму і што мы абавязаны?" Ці не зашмат у нас паборaў -- і латарэйкі па спісу, і прымусовая падпіска на тое, што чытаць немагчыма, і суботнікі вось гэтыя?.. Можа, не трэба неблагую па сутнасці традыцыю суботнікаў ператвараць у чарговы абсурд?

Антон ДУБАЛОМАЎ.



У працяг тэмы

Из Постановления Совета Министров РБ от 2 апреля 2012 г. № 295
"О проведении республиканского субботника в 2012 г."

1. Рекомендовать на добровольной основе провести 21 апреля 2012 г. Республиканский субботник на рабочих местах либо осуществить благоустройство и приведение в надлежащее состояние территорий населённых пунктов. <...>

2. Установить, что:

денежные средства, заработанные на рабочих местах в объёмах, определяемых работниками, в том числе работниками, деятельность которых не связана с производством продукции (работ), в добровольном порядке перечисляются через районные и городские исполнительные комитеты в облисполкомы. <...>

4. Местным распорядительным и исполнительным органам создать в областях, районах и организациях рабочие группы для подготовки и проведения республиканского субботника с учётом участия в нём граждан исключительно на добровольной основе.

(«Национальный реестр правовых актов РБ» 2012 г., № 40, 5/35480)

Якая разумная пастанова! Але слова "ДАБРАВОЛЬНА" выглядае тут неяк дзікавата,бо мы ведаем, як усё адбываецца на самой справе. І ці скончыцца абсурд?

Ёсць пытанне!



“Лукашэнка у сваёй прамове на суботніку 21 красавіка разважаў пра палітузнікаў. Няўжо ў нас ёсць асуджаныя за палітыку?”
З тэлефоннага званка ў “Справу”.

Калі вы дзе пачуеце, што ў Беларусі ёсць палітычныя зняволеныя, то па фармальных падставах гэта не адпавядае рэчаіснасці. Няма ў нас “палітычных”, бо няма адпаведных артыкулаў у Крымінальным Кодэксе. А вось пры Сталіне быў такі сумнавядомы артыкул 58 “Кантррэвалюцыйная дзейнасць”, праз які з 1921 па 1953 гады прайшлі 3.780.000 чалавек. І з нашага раёна шмат каго па ім рэпрэсіравалі - каго растралялі, каго ў Сібір саслалі. Былі нават планы і “разнарадкі” па растрэлах ды высылках. Усё было. .. А сёння такіх жахаў няма. Сёння, калі патрабуецца захаваць стабільнасць у дзяржаве, каб не было аніякіх непатрэбных розгаласаў і каб ніхто не вытаркваўся з агульнага і дружнага шэрагу, пачынаюць працаваць Адміністрацыйны ды Крымінальны кодэксы. Былыя кандыдаты у прэзідэнты Андрэй Саннікаў, Мікалай Статкевіч, Дзмітрый Вус і яшчэ некалькі чалавек атрымалі рэальныя тэрміны турэмнага зняволення за *“арганізацыю беспарадкаў”*. Хоць тыя мінскія “беспарадкі” 19 снежня 2010 года былі даволі цікавыя: некалькі чалавек ломяцца ў дзверы Дома Ўрада, унутры забарыкадзіравалася міліцыя і не дае праходу; тут жа побач ланцуг міліцыянтаў у поўнай амуніцыі з цікавасцю назірае за гэтым ціскам на дзверы і нічога не робіць; кандыдат у прэзідэнты Рымашэўскі пачынае адцягваць хуліганаў ад дзвярэй, звяртаецца за дапамогай да маўклівых стражаў парадку і атрымлівае ад іх дубінкай па галаве; тут жа дубца атрымліваюць і Саннікаў, і Кастусёў, і шмат хто яшчэ. На гэтым “беспарадкі” і скончыліся. І пачаліся судовыя працэсы - па крымінальным артыкуле Кодэкса. А калі працуе крымінальны артыкул, то асуджаныя лічацца крымінальнікамі, а не “палітычнымі”. Тут трэба чотка аддзяляць, так мовіць, *“мух ад катлет”*.

А яшчэ цікавей адбываецца ў больш “лёгкіх” выпадках, калі *“хуліганку шыюць”*. Вось, напрыклад, выйшаў той жа Рыгор Кастусёў у касцюме з гальштукам (як ён звычайна ходзіць) з пад’езда свайго дома ў Магілёве -- да яго падышлі, узялі пад ручкі, завезлі ў міліцыю і саставілі пратакол аб тым, што ён, выйшаўшы з пад’езда, тут жа прысеў на чупышкі і пачаў *“гадзіць”*. І пайшоў Кастусёў за гэта на пятнаццаць сутак. Вось і ўсё: хуліган! Якая тут палітыка? Няма ў нас аніякіх палітузнікаў!..

... Добра, што перад Вялікаднём Андрэя Саннікава выпусцілі з турмы. Памілавалі. А зараз зірніце на гэтыя фоткі: на першай ён - кандыдат у прэзідэнты, прафесійны дыпламат, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол. А на другой - такая сама ён, але прайшоўшы турэмныя універсітэты ад самага пачатку, ясна усведамляючы, што без віны вінаваты. Вось такі адказ на пытанне.





Алесь СУВОРАЎ.

Елена ВЛАДИМИРОВА

Мы шли этапом. И не раз,
Колонне крикнув *«Стой!»*,
Садиться наземь,
в снег и в грязь,
Приказывал конвой.
И равнодушны и немы,
Как бессловесный скот,
На корточках сидели мы
До окрика *«Вперёд!»*

Сто пересылок нам пройти
Пришлось за этот срок!
И люди новые в пути
Вливались в наш поток.
И раз случился среди нас,
Пригнувшихся опять,
Один, кто выслушал приказ
И продолжал стоять.

Спокоен, прям и очень прост
Среди склонённых всех
Стоял парнишка в полный рост,
Над нами, глядя вверх.
Минуя нижние ряды,
Конвойный взял прицел.
«Садись!» - он крикнул.
– Слышишь ты?!
Садись!» Но тот не сел.

Так было тихо, что слыхать
Могли мы сердца ход.
И вдруг конвойный крикнул:
«Встать!
Колонна! Марш! Вперёд!»
И мы опять месили грязь,
Не ведая куда,
Кто, с облегчением смеясь,
Кто бледный от стыда.

По лагерям – куда кого –
Нас растолкали врозь,
И даже имени его
Узнать нам не пришлось.
Но он, красивый и прямой,
Запомнился навек
Над нашей согнутой толпой
Стоящий Человек...

Елена Львовна Владимирова родилась в 1902 г. С.-Петербурге, в дворянской семье. Во время гражданской войны сражалась на стороне красных. Позднее занялась журналистикой. В 1937 г. арестована как жена "врага народа". Пробыла в заключении более 18 лет.

Падрыхтавала Юлія БРУК.

РАДУНІЦА

24 красавіка 2012 г. беларусы адзначылі Радуніцу - дзень ушанавання памерлых. Адпаведна праваслаўнага каляндара, Радуніца заўжды адзначаецца на дзевяты дзень пасля Вялікадня. На Радуніцу з раніцы ідуць у царкву, а потым на могілкі.

У адной з беларускіх прымавак гаворыцца так: *“На Радуніцу да абеду пашуць, у абед плачуць, а пасля абеду скачуць”*.

Беларускія крыніцы пішуць, што Радуніца - самае загадкавае пахавальнае свята сярод усіх, што захаваліся сёння ў Еўропе і наогул у свеце. Сутнасць яго ў тым, каб у гэты дзень вяртацца да магіл і карміць мёртвых родзічаў. Такога няма ні ў кога, акрамя беларусаў. І традыцыя гэтая цягнецца з язычніцкіх, дахрысціянскіх часоў.

Гэтае свята на дзяржаўным узроўні адзначаецца толькі ў Беларусі.

Па дадзеным МУС, могілкі ў Беларусі ў гэты дзень наведвае больш 1,6 млн. чалавек. Для краіны з насельніцтвам меней 10 млн. гэтыя лічбы вельмі паказальныя.

Сяргей ПІСЬМЕННЫ.

Правінцыя і сталіца



Да парламенцкіх выбараў у Беларусі застаецца паўгода. Аднак лідэры апазіцыі ў сталіцы і ў рэгіёнах ніяк не могуць знайсці агульную мову. У магілёўскай вобласці апазіцыянеры вырашылі дзейнічаць, не чакаючы указанняў з Мінску. Магілёўская кааліцыя грамадска-палітычных сіл будзе рыхтавацца да назірання за парламенцкімі выбарамі незалежна ад планаў апазіцыйных лідэраў у Мінску. Таксама будуць вылучацца свае прадстаўнікі ў выбарчыя камісіі і рыхтавацца назіральнікі незалежна ад партыйнай прыналежнасці.

Deutsche Welle.

ЦЕНЫ - ВПЕРЁД!



В Национальном статистическом комитете (Белстате) сообщили, что цены на продовольственные товары в Беларуси за I квартал 2012 года выросли, по отношению к аналогичному периоду 2011 года, на 123,8%. В частности, мясо и птица подорожали на 149,5%, масло растительное - на 137,1%, рыбные консервы - на 195,8%, рыба и морепродукты - на 165%, крупы - на 79,9%, фрукты - 136,7%, чай - на 132,5%, сахар - на 105,5%, кондитерские изделия - на 154,5%, масло животное - на 108,8%. Цены на молоко и молочные продукты выросли на 68,8%, яйца - на 145%, макаронные изделия - на 75,3%, алкогольные напитки - на 150%, табачные изделия - на 140%. Снизились цены только на картофель - на 9,1%.



15 красавіка ўзбуджана крымінальная справа па арт. 339 ч. 1 КК (Хуліганства) у адносінах да непрацуючага несудзімага жыхара в. Раманавічы 1991 г.н., які 3 красавіка каля 19.30, знаходзячыся на Савецкай плошчы, *“оправил естественные надобности”* на вечны агонь мемарыяла «Барацьбітам за савецкую ўладу». За такія дзеянні суд можа адправіць хулігана “на зону” на тэрмін да трох гадоў.

"Хто яшчэ не абілечаны?"

У Магілёўскай вобласці з 6 красавіка павышаны тарыфы на праезд у гарадскім грамадскім транспарце. Кошт адной паездкі ў аўтобусе і тралейбусе павялічыўся да 1300 рублёў.

Тым часам у сталіцы Эстоніі Таліне ў ходзе апытання больш за 75% жыхароў прагаласавалі за пераход на бясплатны праезд у гарадскім грамадскім транспарце. Афіцыйнае рашэнне аб бясплатным праездзе будзе прынята ў верасні.

Сяргей ПІСЬМЕННЫ.



г.Магілёў, Савецкая плошча

“СПРАВА”
Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці, Рэспубліка Беларусь.
Выданне здзяйсняецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі”.

Заснавальнік і адказны за выпуск - Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі, вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: bryli@mail.ru

Матэрыялы друкуюцца на мове аўтараў.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.
Звярстана і надрукавана на ўласным абсталяванні.
Падпісавана да друку 30.04.2012. 21.00.
Наклад 299 асобнікаў. Распаўсюджваецца бясплатна.

ВКонтакте http://vk.com/id168308417